# На тым тыдні...

## Ратуемся спадчынай

✓ Паўднёвыя раёны Брэстчыны здаўна лічацца багатымі на раннія ды якасныя ягады ці гародніну. Апошнім часам нават з'явіліся адпаведныя святы і фестывалі. Сярод іх – рэгіянальнае свята **«Лунінецкія клубніцы»**. Сёлета яно прайшло **26 чэрвеня** ў аграгарадку Дварэц Лунінецкага раёна. Гасцей чакалі шэсце «Клубнічны парад», канцэртная і конкурсная праграмы, тэатралізаваныя і музычныя відовішчы ад самадзейных артыстаў Лунінецкага, Пінскага, Ляхавіцкага, Іванаўскага і Ганцавіцкага раёнаў. Працаваў кірмаш майстроў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, былі ў праграме прадстаўленні сельскіх падворкаў «Клубнічны край», кніжная выстава і паэтычныя чытанні, выставы-продажы лялек і кулінарных вырабаў з клубніцаў.

✓ **6 ліпеня** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылі выставу **«Манумент»**, што праходзіць у межах Рэспубліканскага фестывалю манументальнага мастацтва. Яе арганізатарамі выступілі НББ і Беларускі саюз мастакоў.

Маштабны выставачны марафон, што аб'ядноўвае на розных арт-пляцоўках сталіцы мастакоў-манументалістаў з Мінска і рэгіёнаў Беларусі, знаёміць з новымі тэндэнцыямі ў сучасным айчынным манументальна-дэкаратыўным мастацтве, прадстаўляе шырокай публіцы цікавыя працы вядомых мастакоў-манументалістаў і маладых аўтараў.

У экспазіцыі ў НББ – аўтары з адметным творчым почыркам і светабачаннем, знакамітыя класікі Каміль Камал, Сямён Дамарад, вядомыя беларускія мастакі Андрэй Скіцеў, Алесь Суша, Сяргей Крыштаповіч, Андрэй Кольга і іншыя.

Выкананыя ў розных жанрах і матэрыялах працы разам ствараюць уражанне грандыёзнага палатна. Гэта маштабная мазаіка сучаснага беларускага манументальнага мастацтва.

Плануецца, што выстава будзе працаваць да 1 кастрычніка.

✓ У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага **9 ліпеня** ў рамках выставы жывапісу «О далёком и близком» аб'яднання «Традыцыя» Беларускага саюза мастакоў прайшло выступленне «Классик-джаз трио» з праграмай **«Новая класика»**. У ёй паяднаны традыцыі і новы погляд на іх з XXI ст., мінулае і сучаснасць, далёкае і блізкае, класіка і джаз. Беражлівая трансфармацыя шэдэўраў класічнай музыкі аб'ядноўвае, стварае новыя сэнсы і паказвае шматстайнасць нашага жыцця.